Адпачынак са зместам

13.06.2015 00:55 КАМЕНТАРЫЯЎ: 0 ПРАГЛЕДЖАНА: 54

Адчыніць «Музейныя вароты» ў Літву, Латвію і Беларусь зможа кожны ахвотны.

Летам многія беларусы адпраўляюцца на адпачынак за мяжу. Літаральна турыстычнай Меккай становяцца Турцыя, Егіпет, Францыя... Усё большую папулярнасць набываюць расійскія курорты. А пры гэтым нямногія з нас былі ў прыгранічных краінах Прыбалтыкі. Калі едуць, дык у асноўным па пакупкі на распродажы тавараў. А калі ёсць жаданне наведаць музеі, нешта паглядзець? Для гэтага беларускімі, латвійскімі і літоўскімі партнёрамі і рэалізуецца міжнародны праект «Музейныя вароты».

Каля знака «Полацк — цэнтр Еўропы».

У рамках вышэйзгаданага праекта і адпаведнага прэс-тура карэспандэнта «Звязды» запрасілі «адчыніць» «Музейныя вароты» ў старажытным Полацку. Цікава ўбачыць горад, у якім перыядычна бываеш, вачыма іншаземцаў.

У планах — адзіны квіток...

Можна сказаць, што праект гэты — незвычайны. Ён яднае намаганні па папулярызацыі музейнага турызму і дае магчымасць турыстам на працягу дня ці двух адкрыць для сабе культуру суседняй краіны. Пры гэтым квіток, куплены, напрыклад, у Полацку, дазволіць наведаць і музеі ў Латвіі, Літве. Дарэчы, яшчэ ў 2006 годзе ў Полацку быў распрацаваны адзіны квіток, што дае права наведваць усе ўстановы культуры ў музеі-запаведніку, якіх больш за дзесяць.

— Не бачу асаблівых праблем, каб чалавек, які прыехаў, напрыклад, з Латвіі, наведаў нашы музеі. Пры гэтым на ўваходзе пакажа квіток, што купіў у латвійскім музеі. І наадварот... Тым больш, што ў пасольствах, консульстве Латвіі ў Віцебску даюць «зялёнае святло» ахвотным адправіцца ў музейны тур.

Агульны бюджэт праекта — 1,5 мільёна еўра, у тым ліку 160 тысяч еўра — беларуская частка фінансавання. Галоўная мэта — прасоўванне культурнай спадчыны. Асноўная задача — павышэнне кампетэнцыі музейных супрацоўнікаў, распрацоўка агульнага турыстычнага прадукту і мадэрнізацыя інфраструктуры для абслугоўвання наведвальнікаў. У прыватнасці, у Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку цяпер ёсць аўдыягіды, якія гавораць на рускай, беларускай і англійскай мовах, інфармацыйныя «кіёскі», — распавядае **Ігар ЗАГРЭКАЎ, вядучы навуковы супрацоўнік згаданага музея, мясцовы каардынатар праекта.**

Замежных журналістаў адразу зацікавіла цана квітка. Вядома ж, у краінах ЕС яны каштуюць у разы больш, таму, атрымліваецца, суайчыннікі значна эканомяць. Высветлілася, што пытанне прапрацоўваецца.

— Паміж гарадамі, музеі якіх бяруць
удзел у праекце, параўнальна невялікая адлегласць. Ад літоўскага горада Уценя да Даўгаўпілса прыкладна гадзіна язды. І да Полацка недалёка. Распрацаваны турыстычны маршрут складаецца з шасці частак, надрукавана брашура для турыстаў. Стараемся зацікавіць турыстычныя фірмы, каб яны прапаноўвалі захапляльную паездку тым, хто хоча адкрыць для сабе культурную спадчыну краін памежжа, — распавяла **галоўны менеджар праекта Івета ДУБРОЎСКАЯ.**

Такім чынам у музеі
захоўваецца сценапіс, зняты са сцен храма.

Развёўся? Плаці былой!

Полацк нездарма называюць горадам музеяў. Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік — унікальная гістарычная прастора, помнікі на тэрыторыі якой ахоўваюцца, вывучаюцца, рэстаўруюцца і прыстасоўваюцца пад музейныя экспазіцыі. Усяго ў складзе запаведніка 11 музеяў. Музейны фонд складае больш за 90 тысяч адзінак.

— Сам запаведнік з яго ахоўнай зонай, зонай рэгулявання забудовы, існуючымі і будучымі музеямі з'яўляецца, можна і так сказаць, «ядром», вакол якога ствараюцца ўмовы для ператварэння старажытнага Полацка ў горад-музей, — распавядае **Тамара ДЖУМАНТАЕВА, дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.**

Дарэчы, у Беларусі толькі тры такія запаведнікі: у Полацку, Нясвіжы і Заслаўі.

Экскурсія пачалася з Музея беларускага кнігадрукавання. Сярод іншага ўразіла кніга на французскай мове вагой 26 кілаграмаў. Яна друкавалася як сувенірная да каранацыі рускага імператара. Насілі кнігу два грэнадзёры...

Здзівіла і інфармацыя пра тое, што ў далёкім мінулым, каб упрыгожваць кнігі, загалоўную літару выпісвалі чырвонай фарбай. Адсюль і паняцце «чырвоны радок». А па дарэвалюцыйных правілах дарожнага руху, якія таксама ёсць у музеі, пешыя павінны былі саступаць дарогу конным павозкам...

А яшчэ быў час, калі муж пасля разводу абавязаны быў утрымліваць сваю жонку — пра гэта таксама ёсць запісы.

Вельмі зацікавіла экспазіцыя, прысвечаная Сімяону Полацкаму, Францыску Скарыне.

— Напэўна, пакуль сенсацыю вам не магу гарантаваць, бо ўсё не знаходжу час высветліць, ці ёсць сувязь паміж знакамітым Скарынам і маімі продкамі, але дакладна бабуля мая мела прозвішча Скарына, — здзівіў **рэдактар і выдавец з Літвы Вітаўтас РЫДЫКАС**, які жыве ў горадзе Уцена.

Дарэчы, сёлета адзначаецца 525-я гадавіна з дня нараджэння беларускага першадрукара. У 1990 годзе ў гонар 500-й гадавіны адкрыўся музей кнігадрукавання. Тады з Канады прыязджаў яго нашчадак у 14-м пакаленні, доктар навук, прафесар, які выдатна размаўляў на беларускай мове...

Сярод экспанатаў ёсць і нумары газеты «Звязда» — у першыя гады яе існавання.

Узвышанае і... зямное

Падчас экскурсіі па горадзе госці з задавальненнем фатаграфавалі памятны знак, прысвечаны ўнікальнай літары «Ў». Спадабаўся і знак, які сведчыць, што Полацк — геаграфічны цэнтр Еўропы. Між іншым, на нашым кантыненце каля 10 «цэнтраў» Еўропы. Яны ёсць ва Украіне, у Літве, Польшчы, а ў Расіі ажно два. Экскурсавод растлумачыла, што еўрапейскі кантынент мае дастаткова спаласаваную берагавую лінію. Некаторыя гэта ўлічваюць, а некаторыя — не...

Не засталіся абыякавымі калегі і да помніка Леніну. Такое на вуліцах гарадоў Прыбалтыкі не ўбачыш. Уразіў і «вушасты» жылы дом, што насупраць плошчы Свабоды — так яго называюць праз асаблівасці архітэктуры.

Сафійскі сабор здзівіў велічнасцю. Канцэрт арганнай музыкі расчуліў ледзь не да слёз...

* * *

Не мог не пацікавіцца ў літоўскай калегі, што яна набыла ў Беларусі. Часу было мала, але... Тая сціпла прызналася, што купіла беларускія прадукты. У прыватнасці цукеркі. Купіла калегам «Кароўку», сабе — крэм для твару, мужу — туалетную ваду і цыгарэты. Дома падлічыла, што патраціла ўсяго 15 еўра ў эквіваленце... Дробязь, а прыемна.

Аляксандр ПУКШАНСКІ
Фота аўтара і з асабістага архіва

Полацк — Віцебск

апарыта.

Тэгі: Аляксандр Пукшанскі

Tweet

Like 2

ПАКІНЬЦЕ СВОЙ КАМЕНТАРЫЙ

Імя (абавязкова)

Email (не даступны для іншых карыстальнікаў) (абавязкова)

Ваш сайт (неабавязкова)

Адправіць

НАВІНЫ У БЕЛАРУСІ | НАВІНЫ У СВЕЦЕ

1. Сістэму кіравання якасцю будаўнічых праектаў плануецца ўкараніць у Беларусі з 2016 года
2. Вопыт бязвізавага наведвання Белавежскай пушчы можа быць распаўсюджаны на іншыя трансгранічныя аб'екты
3. Інтэрнэт-магазіны будуць абавязаны прымаць аплату па банкаўскіх картках і праз АРІП
4. Нацбанк у 2016 годзе плануе правесці чарговае даследаванне па ацэнцы фінансавай даступнасці ў Беларусі
5. ДАІ правядзе 26 чэрвеня Адзіны дзень бяспекі дарожнага руху
6. Беларусь зацікаўлена ў развіцці адносін з Мексікай - Дзмітрый Міронч ык

1. Краіны Еўрасаюза дамовіліся размеркаваць 60 тысяч мігрантаў з Італіі і Грэцыі
2. На поўдні Аляскі турыстычны самалёт урэзаўся ў скалу: загінулі дзевяць чалавек
3. У Пакістане расце колькасць ахвяраў анамальнай спякоты
4. Улады Францыі замарозілі мільёны еўра ў сувязі са справай Магніцкага
5. Амерыканскі знішчальнік разбіўся побач з мексіканскай мяжой
6. Да пратэстаў у Ерэване далучыліся яшчэ чатыры гарады Арменіі

Я ЗНОЎ ВЫБІРАЮ «ЗВЯЗДУ»
Віктар Варанец
намеснік дэкана медыка-псіхалагічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага

СВЕЖЫ НУМАР

БЕЛАРУСЬ КІТАЙ

НА ПРАВАХ РЭКЛАМЫ

БЛОГІ

ПРАЕКТНЫЯ ДЭКЛАРАЦЫІ

АУКЦЫЁНЫ

Курсы валют НБ РБ с 2015-06-26		
валюта	курс	+/-
USD	15380.00	+ 2
EUR	17186.00	-62
RUB	281.80	-2.43
Итоги торгов на БВФБ 2015-06-25		
валюта	курс	+/-
USD	15379.75	+ 1.79
EUR	17185.91	-61.69
RUB	281.80	-2.43
Курсы в банках 2015-06-25		
валюта	покупка, max	продажа, min
USD	15380.00	15420.00
EUR	17220.00	17300.00
RUB	281.00	284.00
ИА "ЭКОПРЕСС" www.ecopress.by		

КАМЕНТУЮЦЬ | ПРАГЛЯДАЮЦЬ

1. Скарбы з сэрца краіны 41 КАМЕНТАРЫЯ(Ў)
2. Пара? Пара! 36 КАМЕНТАРЫЯ(Ў)
3. ...Уся ў ранах скразных Беларусь 34 КАМЕНТАРЫЯ(Ў)
4. Дранікі ў аўтарскім выкананні, або Як смажаны сом можа падтрымаць туріндустрыю 29 КАМЕНТАРЫЯ(Ў)
5. Зямля памятае. А мы? 26 КАМЕНТАРЫЯ(Ў)

1. Праектныя дэкларацыі 77386 ПРАГЛЕДЖАНА
2. Аляксандр Васільеў: «Усе звар'яцелі на сексе» 10361 ПРАГЛЕДЖАНА
3. ...Уся ў ранах скразных Беларусь 10161 ПРАГЛЕДЖАНА
4. Беларускі Версаль адрэстаўруюць. Калі? 5823 ПРАГЛЕДЖАНА
5. «Родная прырода»: чытай і любуйся! 4808 ПРАГЛЕДЖАНА

ВАЖНЫЯ СПАСЫЛКІ

DOKTORA.BY информационно-справочный портал Беларуси

КЛУБ 5000 поможем детям с онкологией

© Copyright 2015 — ЗВЯЗДА. Усе правы абаронены. Пры выкарыстанні матэрыялаў партала Zviazda.By размяшчэнне прамой гіперспасылкі на крыніцу абавязкова.